5. Об учреждении Белорусского общества мануфактурной промышленности льном и пенькой // Журнал мануфактур и торговли. – 1839. – Ч. 3. – № 10. – С. 1–10.

6. Об учреждении пароходного общества на р. Западной Двине и ее притоках. Устав акционерного пароходного общества // Журнал мануфактур и торговли. – 1860. – № 11. – С. 66–71.

7. Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830.

8. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. – СПб.: Типография 2-го отделения собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1862.

9. Список акционерных обществ и товариществ на паях по порядку учреждения. Сведения за 1799–1868 гг. // Ежегодник Министерства финансов. – СПб., 1869. – Вып. 1. – С. 308–315.

10. Функ, Я.И. Акционерное общество: история и теория (диалектика свободы) / Я.И. Функ, В.А. Михальченко, В.В. Хвалей. – Минск: Амалфея, 1999. – 608 с.

11. Шепелев, Л.Е. Акционерные компании в России / Л.Е. Шепелев. – Л.: Наука, Ленинградское отделение, 1973. – 347 с.

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРСКІХ УЛАД У БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Карпіевіч В.А.г. Мінск, ДУА “ Камандна-інжынерны інстытут” МНС Рэспублікі Беларусь

Сацыяльна-палітычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы ў 40 – 50-я гг. XIX ст., у значнай ступені аказалі ўплыў на адносіны царскіх улад да гэтых зямель. Урад праводзіў тут асаблівую палітыку, якая павінна была замацаваць дадзеныя землі за імперыяй. Пасля паўстання 1863 – 1864 гг. у заходніх губернях было ўведзена ваеннае становішча, тут былі раскватэраваны ў вялікай колькасці войскі. Уся паўната ўлады належала Віленскаму генерал-губернатару. У краі дзейнічала забарона на стварэнне рознага роду аб’яднанняў і таварыстваў, нават тых, якія мелі мэтай аказанне дапамогі сельскагаспадарчым

вытворцам. І толькі напрыканцы 70-х гг. XIX ст. урад даў дазвол стварыць на Беларусі таварыствы сельскіх гаспадароў, роля якіх была абмежавана пытаннямі аграрнай дзейнасці. Аднак і гэтыя таварыствы знаходзіліся пад пільнай увагай улад.

Сведчаннем таго, што царскі ўрад не лічыў памешчыкаў заходніх губерняў сваёй надзейнай апорай, было ўвядзенне дыферэнцыраванага чыгуначнага тарыфу. Згодна гэтаму тарыфу, было больш выгадна накіроўваць збожжа па чыгунках за мяжу, чым перавозіць для продажу ў межах губерняў. Так, перавоз грузу на адлегласць 567 км каштаваў 6,1 капеек за пуд. У той жа час, перавоз такога ж грузу на адлегласць да 300 км каштаваў 7,46 капеек за пуд [5, с. 202]. Выкарыстанне дадзенага тарыфу прывяло да таго, што рынак Беларусі быў запоўнены больш танным хлебам з расійскіх губерняў. Пуд тульскага жыта ў Вільні каштаваў у гэты час 50 капеек, а кошт аднаго пуда жыта мясцовай вытворчасці складаў 54 капеек, акрамя гэтага, плата за яго перавоз у межах 50 – 150 вёрст была 7,46 кап. за пуд [2, с. 50]. Толькі пасля шматлікіх зваротаў мясцовых памешчыкаў і прадстаўнікоў улад чыгуначныя тарыфы былі зменшаны.

Аднак у цэлым царскі ўрад аказваў падтрымку памешчыцкім гаспадаркам. Адным з такіх мерапрыемстваў было ўвядзенне дзяржаўнай віннай манаполіі. Паводле прынятага закону, дзяржава брала ў свае рукі закуп і продаж спірту, атрыманага на прыватных вінакурнях. Пры гэтым аказвалася падтрымка дробным вытворцам, паколькі дзяржава гарантавала ім збыт прадукцыі, а таксама скупляла ў іх спірт па больш высокай цане. Дадзены закон уступіў у сілу з 1 ліпеня 1897 г., аднак на беларускія землі ён быў распаўсюджаны значна раней – 2 мая 1895 г. [5, с. 260].

Паказчыкам таго, што царскія ўлады не ўлічвалі асаблівасцяў сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель, стала будаўніцтва чыгунак. Чыгуначныя лініі пракладваліся згодна з стратэгічнымі планамі ўрада, часта яны абміноўвалі важныя гандлёвыя цэнтры, якія, напрыклад, Шклоў альбо Магілёў, згубілі сваё ранейшае значэнне. Пры гэтым улады ігнаравалі звароты мясцовых памешчыкаў аб будаўніцтве чыгунак. Так, у 1862 г. яны пакінулі без увагі просьбу памешчыкаў Валынскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў аб будаўніцтве

чыгункі ад Беластока праз Пружаны да Пінска і далей да Валыні [3, л. 1].

Аднак нельга негатыўна ацэньваць ролю чыгуначнага будаўніцтва на Беларусі. Чыгуначныя зносіны аказалі значны ўплыў на развіццё гандлёвай дзейнасці на Беларусі, далі магчымасць павялічыць вываз тавараў за яе межы. Пры гэтым узрасла роля ў якасці важных гандлёвых цэнтраў тых населенных пунктаў, паблізу якіх праходзіла чыгунка.

У заходніх губернях праводзілася асобая палітыка і ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Кацярына II у 1791 г. вызначыла рысу яўрэйскай аселасці, у якую ўвайшлі і беларускія губерні. У 1882 г. царскі ўрад выдаў новы ўказ, паводле якога яўрэям забаранялася сяліцца па-за гарадамі і мястэчкамі, а таксама арандаваць альбо набываць зямлю. Таксама яўрэям забаранялася гандляваць вiном у нядзелю і царкоўныя святы [4, с. 181].

Перанаселенасць гарадоў і мястэчак Беларусі яўрэямі прывяла да таго, што многія з іх былі вымушаны займацца прамысловай дзейнасцю альбо гандляваць. Гэта вызначыла нацыянальны склад гандлёвага саслоўя ў Беларусі, падаўляючая большасць якога была яўрэі. Яны таксама складалі і пераважную большасць гільдзейскага купецтва. Іх адносная колькасць сярод купцоў 1-й і 2-й гільдыі складала ад 80 да 90% і вышэй. Так, у 1868 г. з 85 купцоў 1-й гільдыі ў 5 губернях 69 былі яўрэі [1, с. 762-764]. Згодна перапісу 1897 г., да купецкага саслоўя ў Беларусі адносілася 12045 чалавек, з іх 10536 (альбо 87,5%) – яўрэі. Тое, што амаль увесь гандаль у губернях знаходзіўся ў руках яўрэяў, неаднаразова адзначалі ў сваіх справаздачах і губернатары.

Беларускае купецтва было арганізавана ў гільдыі і карысталася асобымі саслоўнымі прывілеямі, якія дазвалялі ім прымаць удзел у гарадскім самакіраванні. Па патэнтнай сістэме 1839 г. усе купцы павінны былі мець пэўны налічны капітал у залежнасці ад таго, да якой гільдыі яны адносіліся. Так, купцы
1-й гільдзіі павінны былі мець налічны капітал у памеры 15 тыс. рублёў серабром, 2-й – 6 тыс. рублёў, 3-й – 2400 рублёў. Найбольш шматлікай гільдыяй была трэцяя. Вельмі часта ў яе запісваліся прадстаўнікі іншых саслоў'яў, каб атрымаць пэўныя прывілеі, і ў першую чаргу, каб пазбегнуць рэкруцкай павіннасці. З мэтай

узмацнення купецкага саслоў’я ўрад правёў у 1863 г. гільдзейскую рэформу. Згодна з новым палажэннем, скасоўвалася 3-я гільдыя.

У сувязі з развіццём прамысловасці і гандлю ўрад даваў дазвол на адкрыццё розных фінансавых устаноў і рознага роду таварыстваў, хоць тут таксама існавалі пэўнага роду перашкоды. Так, у Расіі ў 1865 г., узнікла першае спажывецкае таварыства, аднак у Беларусі яны з’явіліся больш чым праз чвэрць стагоддзя. І хоць яшчэ ў 1883 г. мясцовыя ўлады далі дазвол на стварэнне Віцебскага таварыства спажыўцоў, царскія ўлады такім чынам унеслі папраўкі ў яго статут, што адкрыццё гэтага таварыства стала немагчымым. У 1890 г. быў распрацаваны яго новы статут, аднак само таварыства пачало дзейнічаць толькі з 1897 г.

Такім чынам, можна вызначыць, што палітыка царскіх улад на Беларусі была неадназначнай. З аднаго боку, царызм не лічыў мясцовае насельніцтва, у тым ліку і памешчыкаў, сваёй надзейнай апорай у краі. З другога боку, улады вымушаны былі праводзіць значныя пераўтварэнні, якія ў пэўнай меры садзейнічалі развіццю гандлю ў Беларусі.

Выкарыстаная літаратура

1. Адрес-календарь Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. / [Сост. А. Сементовским. – Вильна: Тип. К. Вульфа, 1868]. – 246 с.

2. Дудкоў Д. А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX ст. і пачатку XX ст. / Д.А. Дудкоў. – Мінск: Дзярж. выд. Беларусі “Партмассектар”, 1932. – 203 с.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1458.

4. Полное собрание законов Российской империи. Собр. 3. – СПб.: Гос. тип., 1882. – Т. 2. – 1139 с.

5. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900 – 1917 / Г. Т. Ковалевский [и др.]; под ред. Г.Т. Ковалевского. – Минск: Изд. Акад. наук БССР, 1963. – 420 с.